# Няхай жыве Першае мая —

## БАЯВЫ АГЛЯД РЭВОЛЮЦЫЙНЫХ СІЛ МІЖНАРОДНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА!

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцеся!

# ЗА ЛЕНІНСКІЯ КАДРЫ

ОРГАН ПАРТКОМА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 8 (20) 1 мая 1936 г. № 8 (20)





УНУКІ НАШЫ, ЯК ДЗІКОВІНКУ, БУДУЦЬ РАЗГЛЯДВАЦЬ ДАКУМЕНТЫ І ПОМНІКІ ЭПОХІ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА ЛАДУ. ЯНЫ З ТРУДОМ ЗМОГУЦЬ УЯВІЦЬ САБЕ, ЯКІМ ЧЫНАМ МОГ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў ПРЫВАТНЫХ РУКАХ ГАНДАЛЬ ПРАДМЕТАМІ ПЕРШАЙ НЕАБХОДНАСЦІ, ЯК МАГЛІ НАЛЕЖЫЦЬ ФАБРЫКІ І ЗАВОДЫ АДДЗЕЛЬНЫМ АСОБАМ, ЯК МОГ АДЗІН ЧАЛАВЕК ЭКСПЛААТАВАЦЬ ДРУГОГА, ЯК МАГЛІ ІСНАВАЦЬ ЛЮДЗІ, ЯКІЯ НЕ ЗАЙМАЮЦЦА ПРАЦАЙ. ДА ГЭТАГА ЧАСУ, ЯК АБ КАЗЦЫ, ГАВАРЫЛІ АБ ТЫМ, ШТО ЎБАЧАЦЬ ДЗЕЦІ НАШЫ. АЛЕ ЗАРАЗ, ТАВАРЫШЫ, ВЫ ЯСНА БАЧЫЦЕ, ШТО ЗАКЛАДЗЕНЫ НАМІ БУДЫНАК СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА ГРАМАДСТВА — НЕ ЎТОПІЯ. ЯШЧЭ БОЛЬШ СТАРАННА БУДУЦЬ БУДАВАЦЬ ГЭТЫ БУДЫНАК НАШЫ ДЗЕЦІ.

**ЛЕНІН.**

(З прамовы на Краснай плошчы ў Маскве 1 мая 1919 г.).

# ПЕРШАЕ МАЯ

Першае мая—вялікае міжнароднае свята працы, дзень міжнароднай пролетарскай салідарнасці.

З гарачай радасцю і шчасцем сустракаюць народы краіны соцыялізма гэта вялікае свята. Адышлі і ніколі не вернуцца да нас чорныя дні галечы і беспрацоўя. У нашай краіне будуецца бясклясавае соцыялістычнае грамадства. Працоўныя горада і вескі, працоўныя ўсіх нацыянальнасцей складаюць адну сям'ю будаўнікоў соцыялізма. І ва ўсіх кутках бязмежнага Савецкага Саюза—на Сахаліне і ў Беларусі, на Каўказе і ў Арктыцы, у Маскве і на Памірах наш народ праяўляе небывалы гераізм працы, адвагі, ініцыятывы і бясстрашнасці на ўсіх участках соцыялістычнай будоўлі. І ніколі ні адзін народ не любіў так сваёй радзімы, як любім яе мы. Якой вялікай любоўю авейвае наш народ свайго кравадыра тав. **Сталіна.** Паэты пра яго песні складаюць на ўсіх мовах народаў СССР. І малыя і старыя дзякуюць за мудрае кіраўніцтва, за тое, што «жыць стала лепш, жыць стала весялей».

И никогда таких веселых песен
Не распевала ни одна страна.

На ўсім свеце толькі адна такая краіна—наша радзіма, дзе моладзь усе свае мары можа ператварыць у жыццё, у сапраўднасць. І няма канца нашым магчымасцям! Толькі, героі-лётчыкі, героі-патранічнікі. нага сёння і яшчэ лепшага заўтра, з народу маглі выйсці Стаханавы, Вінаградавы, Крываносы, Дземчэнкі, героі-лётчыкі, героі-патранічнікі.

Знішчана тая велізарная грань паміж горадам і вёскай, што была ў праклятым мінулым. У вёсцы расце буйная соцыялістычная выт ворчасць, аснаваная на машыннай тэхніцы; выраслі новыя кадры работнікаў соцыялістычнай гаспадаркі. Сельская гаспадарка дагнаяе прамысловасць. На індустрыяльным фундаменце расце новая соцыялістычная культура. Шпарка развіваецца навука і мастацтва на ўсіх прасторах Савецкага Саюза.

Перад намі, навуковымі работнікамі і студэнтамі, партыя высоўвае сёння задачу—дасканала авалодаць вышынямі навукі. Вучыцца на «выдатна», выйсці высокакваліфікаванымі спецыялістамі. Нам стварылі найлепшыя ўмовы вучобы, і мы павінны з гонарам апраўдаць давер'е партыі. Мы павінны вучыцца на «выдатна!»

Зусім інакш будуць святкаваць сорак сёмую маёўку пролетарыят, працоўныя масы і моладзь капіталістычных краін.

«Няпчасце быць маладым»—так назваў сваю кнігу аб моладзі французскі пісьменнік Вайян Куцур'е. І гэта праўда. Работы няма. Беднасць і галеча пазбаўляе моладзь усёй радасці юнацкіх год—пазбаўляе шчасця.

У дзень Першага мая на сцягах рабочых і працоўных ўсіх краін агнёвымі літарамі будуць гарэць лозунгі барацьбы супроць вайны, супроць фашызма, за адзіны пролетарскі і народны антыфашысцкі фронт барацьбы.

Народы Савецкага Саюза гатовы ў любы момант выступіць на абарону соцыялістычнай радзімы. Дорага заплоціць той, хто адважыцца напасці на нас! Наша Чырвоная армія пад кіраўніцтвам нашай партыі і першага маршала Савецкага Саюза Кліма Ефрэмавіча **Варашылава** непераможна.

Дзень Першага мая будзе найвялікшай дэманстрацыяй гатоўнасці соцень мільёнаў працоўных усяго свету з яшчэ большай адданасцю, беззаветнасцю змагацца і перамагаць пад кіраўніцтвам Комуністычнага Інтэрнацыянала, пад сцягам і вадзіцельствам нялікага Сталіна.

У дзень Першага мая наша радасная моладзь, наша студэнцтва высока ўзніме свае сцягі, на якіх будзе напісана: «Дзякуй таварышу **Сталіну** за шчаслівае жыццё».

РАБОЧЫ КЛАС СССР МОЦНЫ НЕ ТОЛЬКІ ТЫМ, ШТО Ў ЯГО ЁСЦЬ ВЫПРАБАВАНАЯ Ў БАЯХ ЛЕНІНСКАЯ ПАРТЫЯ. ЁН МОЦНЫ, ДАЛЕЙ, НЕ ТОЛЬКІ ТЫМ, ШТО МАЕ ПАДТРЫМАННЕ МІЛЬЁННЫХ МАС ПРАЦОЎНЫХ СЯЛЯН. ЁН МОЦНЫ ЯШЧЭ ТЫМ, ШТО ЯГО ПАДПІРАЕ І ЯМУ ПАМАГАЕ СУСВЕТНЫ ПРОЛЕТАРЫЯТ. РАБОЧЫ КЛАС СССР ЁСЦЬ ЧАСТКА СУСВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА, ЯГО ПЕРАДАВЫ АТРАД, А НАША РЭСПУБЛІКА — ДЗЕЦІШЧА СУСВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА. НЕ МОЖА БЫЦЬ СУМНЕННЯ, ШТО КАЛІ-Б НЕ БЫЛО Ў ЯГО ПАДТРЫМАННЯ З БОКУ РАБОЧАГА КЛАСА КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН, ЁН НЕ ЎТРЫМАЎ-БЫ ЎЛАДЫ Ў СВАІХ РУКАХ, ЁН НЕ ЗАБЯСПЕЧЫЎ-БЫ ЎМОЎ ДЛЯ СОЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА, — СТАЛА БЫЦЬ, Ў ЯГО НЕ БЫЛО-Б ТЫХ ПОСПЕХАЎ, ЯКІЯ ЁН МАЕ ЦЯПЕР.

ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНЫЯ СУВЯЗІ РАБОЧАГА КЛАСА СССР З РАБОЧЫМІ КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІН, БРАЦКІ САЮЗ РАБОЧЫХ СССР З РАБОЧЫМІ ЎСІХ КРАІН, — ВОСЬ АДЗІН З КРАЕВУГОЛЬНЫХ КАМЕНЯЎ СІЛЫ І МАГУТНАСЦІ РЭСПУБЛІКІ СОВЕТАЎ. РАБОЧЫЯ НА ЗАХАДЗЕ ГАВОРАЦЬ, ШТО РАБОЧЫ КЛАС СССР З'ЯЎЛЯЕЦЦА ЎДАРНАЙ БРЫГАДАЙ СУСВЕТНАГА ПРОЛЕТАРЫЯТА... ГЭТА АБАВЯЗВАЕ НАС К ТАМУ, КАБ ПРАЦАВАЦЬ ЛЕПШ І ЗМАГАЦЦА ЛЕПШ ЗА КАНЧАТКОВУЮ ПЕРАМОГУ, СОЦЫЯЛІЗМА Ў НАШАЙ КРАІНЕ, ЗА ПЕРАМОГУ СОЦЫЯЛІЗМА ВА ЎСІХ КРАІНАХ.

**СТАЛІН.**

(З даклада на XVII з'ездзе ВКП(б).

## Вышэй сцяг міжнароднай пролетарскай салідарнасці!

# Жыць стала лепш, жыць стала весялей

Родина — мать!
За счастье любить тебя — каждый
На подвиг идет не однажды,
Чтоб сердцем, чтоб волей отважных
На каждой тропе побеждать!

(З верша Сергея Остравога «Молодость мира).

## Жыць стала лепш

Дзе, у якой краіне студэнцтва з працоўнага асяроддзя жыве так, як жыве наша студэнцтва, студэнцтва краіны соцыялізма?

У прыватнасці, хачу кароценька расказаць пра сябе. Я, студэнт 2-га курса, сямейны. На рабфаку было труднавата. Праўда, цяжкасці былі звязаны з тымі цяжкасцямі, якія перажывала ўся краіна.

Цяпер, калі адышлі ў мінулае ўсякія нормы і картачкі на прадукты, калі з кожным годам усё больш і больш знижаюцца цэны на прадукты харчавання, жыццё маёй сям'і значна палепшылася. Лепш сталі мы і адзявацца. Акрамя гэтага, за апошні час я набыў цэлую бібліятэку з 87 кніжак. Маю поўнасцю збор твораў Леніна, усе томы «Капітала» Карла Маркса, творы Сталіна і інш. Набыў радыё, а ў хуткім часе думаю набыць фотаапарат. Часта наведваю кіно і тэатр.

Усё гэта — вынік штодзенных клопатаў аб нас партыі і ўрада, клопатаў любімага нашага правадыра тав. Сталіна.

**ПЕРАПЕЦКІ.**

У аранжарэі біяфака.

## Па камяністай дарозе

— Уставай, поўдзень ужо блізка,— прагрымела гаспадыня, не перастаючы штурхаць мяне ў бок, (да ўсхода сонца заставалася яшчэ паўтары-дзве гадзіны).

Я хуценька ўскапыўся з разасланага на падлозе старога піджака, працёр вочы кулаком і апрануў світку, якой накрываўся.

— На тое кавалак хлеба, а ў лесе цяпер ягад многа—вось і перакусіш да снедання.

Да ўсходу сонца я з статкам кароў быў ужо ў суседнім лесе. Каля 12 гадзін дня я прыгнаў статак з пашы. Бясконца стомлены, я ледзь цягнуў ногі.

— Сняданне там, на стале, — крыкнула гаспадыня з гароду, калі я загнаў жывёлу ў хлеў. На стале стаяла міска прастаквашы, кавалак хлеба і халодная бульба. Пасля снедання ўвайшла гаспадыня ў хату, і я атрымаў чарговы загад.

— Я адпачну крыху, а то ўжо вельмі сонца прыпякло, а ты вазьмі Стасіка і пагуляй з ім да абеда.

На працягу прыблізна двух-трох гадзін я глядзеў за дзецьмі, пасля зноў пачаў жывёлу. Увечары, толькі я хацеў ісці адпачываць, як гаспадар загадаў весці конь на начлег.

— Я толькі павячэраю і зараз прыду цябе зменщь,— паабяцаў ён.

Была ўжо глыбокая ноч, калі прышоў гаспадар і адпусціў мяне дамоў.

Гэта — тыповы дзень з майго жыцця на працягу чатырох год.

Вучыцца гэтыя годы мне прыкодзілася вельмі мала: па тры-чатыры месяцы, пакуль снег накрываў зямлю. Але школу скончыў я вельмі паспяхова.

У 1928 годзе я паступіў у Чавускую сямігодку. Маці не магла пратрымаць мяне на свае сродкі.

Я атрымліваў дапамогу ад школы, комсамольскага калгаса імя Кім, у якім я працаваў у часе летніх канікул. Гэта дало мне магчымасць скончыць школу, затым педкурсы. Хоць я і скончыў у часе настаўніцкай працы завочны Комвуз, а затым здаў частку завочных заданняў за першы курс фізмата БДУ, але не хацеў на гэтым спыніцца і ўвесь час марыў аб сталай вучобе.

У 1935 г. мае мары, нарэшце, збыліся. Я стаў студэнтам вышэйшай навучальнай установы. Перада мной, як і перад усёй моладдзю Совецкага Саюза, шырока адчынены дзверы ў шчаслівую будучыню.

**Ф. КАНСТАНЦІНАЎ.**

## СОВЕЦКАЯ МОЛАДЗЬ

**Ва ўсіх** галінах народнай гаспадаркі Совецкага Саюза на 1 студзеня 1935 года працавала 6.917.400 чал. моладзі, у тым ліку ў прамысловасці было занята звыш 3 млн. чалавек, у сельскай гаспадарцы—863 тыс. і на транспарце—702 тыс.

***

**Многа моладзі** сярод інжынерна-тэхнічных работнікаў: у цэлым па ўсёй прамысловасці 12 проц., у хімічнай прамысловасці—19, у машынабудаўнічай—13, у металургіі —11.

З 1930 па 1935 год значна ўзрасла колькасць жаночай рабочай моладзі; у 1930 годзе жаночая моладзь складала 31,2 проц. усёй рабочай моладзі, а ў 1935 годзе — 43,7 проц.

***

**Некаторыя** нашы прадпрыемствы, асабліва новапабудаваныя, можна смела назваць «маладзёжнымі». На чэлябінскім трактарным заводзе маладыя рабочыя і вучні складаюць 47 проц. усёй колькасці рабочых; на першым дзяржпадшыпнікавым заводзе імя Л. М. Кагановіча—42 проц., на сталінагорскім хімкамбінаце імя Сталіна—60 проц. (Вестка на першае ліпеня 1935 года.)

***

**У навучальных** установах СССР вучыцца зараз 31.500 тыс. чалавек (у 1914 годзе вучылася толькі 8.200 тыс.) Акрамя таго, на розных курсах падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі кадраў вучылася ў мінулым годзе 5.500 тыс. чалавек.

***

**На 9 лютага** гэтага года ў краіне было 578 маладых ордэнаносцаў—мужчын і сканчын. З іх узнагароджана ордэнам Леніна 206 чалавек, ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцягу—187 чалавек, ордэнам Чырвонай Зоркі — 77 чалавек, ордэнам «Знак почета» — 108 чалавек.

Над страной весенней ветер веет,
Всюду стало радостнее жить,
И никто на свете не умеет
Лучше нас смеяться и любить.

(З «Песни о родине» В. Лебедзева-Кумача).

Група студэнтаў 2 курса гістфака

## МНОГА ПРОЙДЗЕНА І МНОГА НАБЫТА

Стоячы на парозе заканчэння вучобы ва ўніверсітэце і аглядаючыся на пройдзены шлях, хочацца сказаць многа і вельмі многа.

Наш выпуск працаваў у асабліва сложных умовах. Многія з нас не мелі сярэдняй асветы, ды і з сярэдняй асветай мелі вельмі слабую падрыхтоўку. Сярэдняя школа не навучыла нас самастойна працаваць над кнігай. Я лічу адным з галоўных дасягненняў нашага ўніверсітэцкага шляху тое, што студэнты навучыліся самастойна працаваць, і не толькі над вучэбнымі кнігамі, але і над навуковай літаратурай.

За гэтыя чатыры гады многа пройдзена, многа набыта ведаў; крутазор студэнта — навуковы і культурны — значна пашырыўся. Зараз мы зусім не падобны на тых людзей, якія паступілі на першы курс. Універсітэт даў нам веды не толька ў галіне спецыяльных прадметаў, ён з'явіўся для студэнта школай палітычнага і грамадскага жыцця, выхоўваючы не наогул спецыялістаў, а спецыялістаў палітычна свядомых і грамадска актыўных.

Нельга, аднак, моўчкі абыйсці тыя недахопы ўніверсітэцкага **жыцця, якія балюча адбіліся на** нас, выпускніках. У прыватнасці наш выпускны курс хімфака захапіў яшчэ перыяд брыгаднай і канвеернай сістэмы, што значна адбілося на нашых ведах. Дрэнна было пастаўлена выкладанне на першым курсе нямецкай мовы. Большасць студэнтаў не разумела важнасці яе. Цяпер гэта адчуваюць вельмі і вельмі многія з нас у часе дыпломных работ. На поадыгу ўсёй нашай вучобы не было навукова-даследчай работы студэнтаў, не было самастойнай эксперыментальнай працы пад кіраўніцтвам прафесара.

Новая змена студэнтаў паступае ва ўніверсітэт больш падрыхтаванай, чым мы, і можна спадзявацца, што веды гэтай змены будуць значна шырэй і глыбей нашых.

Многім абавязаныя ўніверсітэту, мы ва ўсёй сваёй далейшай працы будзем імкнуцца быць чэснымі, адданымі спецыялістамі нашай вялікай соцыялістычнай радзімы.

**ПРЫЛЕЖАЕВА.**

## *Мы — самая вясёлая моладзь*

У бібліятэчным корпусе, у фізкорпусе аб'явы, аб'явы... Сёння заняткі гуртка заходнееўрапейскіх танцаў; заўтра пачынае працаваць гурток домравых інструментаў; 25-га адбудзецца спеўка харыстаў...

— Прыходзьце слухаць мяна на вечар самадзейнасці, — гаворыць таварышам студэнт фізмата Родаў. Я буду сярод удзельнікаў гуртка. Будзем выконваць «Музыкальны момант» Шуберта, «Гібель Чапаева», «Тры экосезы»...

**

У бібліятэцы за сталом студэнтка Ліза і Соня пільна ўглядаюцца ў сшыткі. Іх увага сканцэнтравана на функцыях Гамільтона. Гэта трудны адзел тэарэтычнай механікі. Яны больш трох гадзін не выходзяць з бібліятэкі. Нарэшце, функцыі Гамільтона вывучаны. Цяпер можна адпачыць, цяпер можна схадзіць у кіно паглядзець «Партыйны білет».

З якім захапленнем глядзіцца гэта карціна! Колькі яна навявае новых думак!

Доўга яны абгаворвалі гэты выдатны фільм. Ім хацелася шчыра падзякаваць за яго совецкую кінематаграфію.

***

Некалькі дзён назад можна было бачыць групу дзяўчат у фізкультурных касцюмах з процігазамі і вінтоўкамі за плячыма. Квеско, Сысько, Кубіцкая, Барысевіч, Кавецкая—удзельніцы гарадскога спаборніцтва ПВХО. Яны заваявалі першае месца сярод жаночых каманд. Яны прайшлі пяць кілометраў у процігазах за 33 мінуты замест 40 і выбілі 337 ачок з 500 магчымых.

Весела вучыцца, весела нам жыць! Мы ўпарта авалодваем ведамі, каб стаць высококваліфікаванымі настаўнікамі эпохі вялікага Сталіна. Мы спяваем песні, танцуем, іграем, смутку ў нас ніколі няма. Наша студэнцтва—самая вясёлая, самая шчаслівая моладзь у свеце.

**ЗІНГЕР.**

Лепшыя фізкультурніцы ўніверсітэта

НА ЗДЫМКУ (злева направа): Кукіна — студэнтка хімфака, Камянецкі — студэнт геафака, прафесары Ермоленка і Годнеў, Пятровіч—студэнт біяфака, Какашынскі — студэнт гістфака, Машкоўскі — студэнт фізмата.

## ПАСТУПАЮЧЫ ВА УНІВЕРСІТЭТ

Не без добрых душ на свете,-
Кто-нибудь свезет в Москву,
Будешь в университете-
Сон свернится на яву.
**Некрасов.**

Да Вялікай пролетарскай рэвалюцыі навука была пад сямю замкамі для мільённых працоўных мас. Толькі адзінкі, перамагаючы ўсе перашкоды, ледзь-ледзь прабіваліся «ў людзі».

У нашай краіне працоўная моладзь не мае ніякіх перашкод у, набыцці ведаў, у авалодванні навукай.

Рабфакаўцы набліжаюцца к заканчэнню вучэбнага года. Выпускнікі сур'ёзна і ўпарта рыхтуюцца да заліковай сесіі. Яны ведаюць, што пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы прыйдзецца вытрымаць сур'ёзны конкурс.

Студэнты ўжо зараз выбіраюць сабе спецыяльнасці: адны пойдуць на фізмат, другія на гістфак, трэція на біяфак. Я надзвычай цікавлюся хіміяй і мару аб хімічным факультэце.

На рабфаку мы навучыліся самастойна працаваць над кнігай, атрымалі прыстойныя веды фізікі, матэматыкі, хіміі, геаграфіі, гісторыі і з поспехам можам прадаўжаць вучобу ў вышэйшай навучальнай установе.

Мы ведаем, што ў нашай краіне няма лішніх людзей. У мінулым чорнарабочы, беспрытульны сёння — рабфакавец, а заўтра студэнт вышэйшай навучальнай установы.

Большэвіцкая партыя, кіруемая таварышом Сталіным, усёй нашай моладзі дае пуцёўку ў жыццё.

**Студэнт 2-га курса рабфака БАЛАШОЎ.**

# НАША СТУДЭНЦТВА — ШЧАСЛІВАЯ МОЛАДЗЬ

*Акадэмік Ц. БУРСТЫН*

Да Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Расіі, а ў капіталістычных краінах і нават, усё студэнцтва складалася і складаецца з дзяцей буржуазіі, буйнага чыноўніцтва і, часткова, заможнага сялянства. Дзяржава не забяспечвала студэнтаў ніякімі сродкамі; вучоба была платная, толькі частка дробна-буржуазнага студэнцтва атрымоўвала ільготы ў форме вызвалення ад платы за вучобу.

Ва ўсіх амаль капіталістычных краінах, галоўным чынам у Германіі і Аўстрыі, існавалі студэнцкія аб'яднанні, у якія прымаліся студэнты толькі арыйскага паходжання. Задачай гэтых нацыяналістычных аб'яднанняў было падняць шавіністычныя і антыпролетарскія настроі, шырока выкарыстоўваючы антысеміцкую дэмагогію. У аб'яднанні ўваходзіла так званае вечнае студэнцтва, якое не вучылася, а займалася «аховай» арыйскага духу ва ўніверсітэтах, наладжваючы па некалькі разоў у год разгром няўгодных ім сацыяльных і нацыянальных адносінах студэнтаў. Гэтыя аб'яднанні з'явіліся пасля імперыялістычнай вайны сацыяльнай апорай і касяком гітлераўскіх штурмавых арганізацый.

Ужо напярэдадні вайны ў капіталістычных краінах была вялікая перавытворчасць інтэлігенцыі. Значная колькасць скончыўшых вышэйшыя навучальныя установы не маглі прымяніць атрыманыя веды на практыцы.

У сучасны момант за граніцай становішча інтэлігенцыі катастрафічнае; яркай ілюстрацыяй гэтага з'яўляецца скарачэнне ліку навучальных і навуковых устаноў, скарачэнне кантынгенту набораў, прапаганда супроць паступлення ў вышэйшыя навучальныя установы і супроць навукі наогул.

У краінах капітала шырока распаўсюджаны словы «няшчасце быць маладым».

Якая-ж каласальная розніца паміж становішчам моладзі ў капіталістычных краінах і становішча моладзі ў нас, у краіне сацыялізма, дзе няма капіталістаў, няма памешчыкаў, няма эксплаатацыі чалавека чалавекам, дзе будуецца радаснае, шчаслівае жыццё.

Наша студэнцтва—гэта маладыя рабочыя калгаснікі, гэта дзеці рабочых і калгаснікаў, дзеці совецкай інтэлігенцыі.

Наша партыя, наша дзяржава аказвае максімальную дапамогу і бацькоўскія клопаты совецкаму студэнцтву, забяспечвае яго стыпендыяй, утульнай, цёплай і светлай кватэрай, культурным абслугоўваннем, штодзенна клапоціцца аб яго здароўі.

Наша моладзь мае неабмежаваныя магчымасці павышаць сваю кваліфікацыю. Наша моладзь не мае клопатаў у падшуканні работы пасля заканчэння вучобы. Наша студэнцтва ўпэўнена ў сваёй будучыні, упэўнена ў заўтрашнім дні.

У нас мінулыя батракі, чорнарабочыя часта становяцца выдатнымі спецыялістамі, вучонымі.

Апошняя пастанова нашай партыі і ўрада аб павышэнні заработнай платы настаўнікам—яркі паказчык выключных сталінскіх клопатаў аб чалавеку. Гэта пастанова садзейнічае далейшаму паляпшэнню работы нашых школ, нашых ВНУ; яна садзейнічае выхаванню моладзі, павышэнню граматнасці і ўзняццю культуры.

Мы ідзем па шляху гіганцкага росквіту социялістычнай культуры. Мы ідзем па шляху радаснага шчаслівага жыцця. Перамога за намі. Парукай гэтаму—мудрае кіраўніцтва вялікага **Сталіна.**

## *Весела жывём і спорна працуем*

Вялікае свята—Першае мая студэнцтва III курса заолагаў біяфака сустрэла з найлепшымі паказальнікамі: больш 80 проц. студэнтаў здалі дысцыпліны на «добра» і «выдатна».

На курсе за ўвесь навучальны год не было ніводнай адзнакі «дрэнна». Нашы студэнты ўзялі абавязацельства і надалей не знікаць якасці вучобы.

У прадсвяточныя дні на курсе радаснае ажыўленне: адны рыхтуюць да дэманстрацыі лозунгі, плакаты, партрэты правадыроў, транспаранты; другія ў сваіх пакоях упрыгожваюць куткі кветкамі і партрэтамі, запрашаюць таварышоў на свята да сябе.

— Весела і радасна правядзем свята і ўдарна будзем працаваць пасля свята,—заяўляюць у адзін голас студэнты III курса заолагаў.

**П. ПЯТРОВІЧ.**

## ЗАКАНЧВАЮЧЫ УНІВЕРСІТЭТ

Я смела іду насустрач сваёй будучыні. Я ўпэўнена, што ў Совецкім Саюзе, у краіне социялізма заўсёды знойдзецца для мяне работа, якая адпавядае маёй кваліфікацыі, маім жаданням. Чатыры гады таму назад я прыйшла на фізмат з вялікім жаданнем вывучыць самыя любімыя і самыя «рамантычныя» для мяне навукі.

Чатыры гады... Якім багатым зместам напоўнен для мяне гэты час! Мы, выпускнікі, раслі і развіваліся разам з нашым выхаваўцам - універсітэтам.

Нельга, аднак, сказаць, што работа ў нашым універсітэце, наша вучоба былі наладжаны ўзорна. Нам прыйшлося перажыць цэлы рад недахопаў і недагэлак у вучэбным працэсе.

Цяпер перад намі адказнейшая задача — напісаць дыпломную работу. Трэба думаць, што з гэтай задачай справяцца нашы дыпломнікі. Я, у прыватнасці, працую над цікавай, яшчэ мала распрацаванай тэмай — новай тэорыяй электрамагнітнага поля Борна. Тэма даволі складаная, яна патрабуе напружанай працы. Думаю, што змагу скарыстаць атрыманыя мною веды і абараніць дыплом з пакаёчыкамі не горшымі, чым мела ў вучобе. Я кончаю універсітэт, але адчуваю, што мне трэба вучыцца і яшчэ раз вучыцца.

Апошняя пастанова аб настаўніках выклікала ў нас дыпломнікаў, небывалы энтузіязм. Мы з радасцю прыступілі да пачэснай педагагічнай работы.

У нашай краіне, дзе па кожным кроку адчуваюцца сталінскія клопаты аб людзях, вялікае шчасце быць настаўнікам, выхоўваць падрастаючае пакаленне. **ПЕРЛАМУТР.**

**КУЧЫНСКІ** — **ЧВА рэктара БДУ.**

# ГЭТА МАГЧЫМА ТОЛЬКІ У НАС

Наша партыя і ўрад удзяляюць велізарную ўвагу навуцы і асвеце. Выступаючы на III з'ездзе комсамола, Уладзімір Ільіч гаварыў, што трэба вучыцца, вучыцца і яшчэ раз вучыцца. Яшчэ ў гады барацьбы на франтах грамадзянскай вайны, барацьбы з унутраным ворагам, барацьбы з гаспадарчай разрухай — партыя і ўрад адкрывалі школы, інстытуты і універсітэты.

Леніны вучань Леніна таварыш Сталін асабіста займаецца справамі школы. Дзякуючы яго кіраўніцтву, яго клопатам, нашы школы, нашы настаўнікі, нашы студэнты знаходзяцца ў найлепшых умовах.

Толькі ў краіне социялізма, у выніку ажыццяўлення ленінска-сталінскай нацыянальнай палітыкі партыі — ордэнаносная БССР мае каля двух дзесяткаў вышэйшых навучальных устаноў, да сотні тэхнікумаў, тысячы школ і дашкольных устаноў. Выдаткі на народную асвету ў нас каласальна ўзраслі.

Нова-пабудаваныя карпусы нашага ўніверсітэцкага гарадка, дасканалае абсталяванне нашых лабараторый, новабудуемы інтэрнат наглядныя паказчыкі клопатаў дзяржавы аб асвеце. Калі ў 1935 г. дзяржава выдаткавала на аднаго студэнта БДУ 2521 руб., то ў гэтым годзе выдаткоўваецца на аднаго студэнта 3117 руб., г. зн. на 23 проц. больш.



У гэтым годзе выдаткі на культурнае абслугоўванне студэнта павялічваецца на 60 проц. Таксама на 60 проц. павялічваюцца выдаткі на медабслугоўванне.

Дзе магчымы яшчэ такія клопаты, такія выдаткі на асвету, акрамя нашай социялістычнай радзімы!

У фашысцкай Германіі, Польшчы і інш. краінах растуць толькі выдаткі на вайну, на новыя ўзбраенні. Ва ўніверсітэтах і іншых вышэйшых навучальных установах даюць асвету толькі сынкам багатых. Акрамя высокай платы за навучанне, для бядняцкіх слаёў там існуе яшчэ цэлы рад абмежаванняў. Для рабочай і сялянскай моладзі там шырока расчынены дзверы турмаў, фашысцкіх засценкаў, канцэнтрацыйных лагераў. Ды навошта канчаць вышэйшыя навучальныя ўстановы, калі чорная здань беспрацоўя заўсёды стаіць над большай часткай моладзі, пачынаючай самастойнае жыццё.

Для совецкай моладзі адкрыты неабмежаваныя магчымасці творчай працы на карысць социялізма ў любой галіне нашай социялістычнай гаспадаркі і культуры. Хочаш быць вучоным, інжынерам, педагогам, лётчыкам, артыстам— і ты ім будзеш.

Совецкая моладзь добра разумее, што ўсё гэта дала нам наша партыя, кіруемая вялікім Сталіным, і ўсведамленне гэтага выклікае вялікую любоў да нашай партыі і радзімы.

Мы можам прывесці тысячы прыкладаў небывалага ў свеце гераізма нашай моладзі. Гэта наша моладзь паказвае социялістычную прадукцыйнасць працы, гэта моладзь падымае са дна мора караблі, ляціць у стратасферу, будуе новыя гарады, асвойвае Арктыку. Сотні юнакоў і дзяўчат урад узнагародзіў ордэнам.

Наш універсітэт за 15 год свайго існавання даў тысячы новых высока кваліфікаваных спецыялістаў. Многія з іх працуюць на адказнейшых участках социялістычнай гаспадаркі — ператвараюць торф у вугаль, вынаходзяць новыя рэсурсы для социялістычнага будаўніцтва, з'яўляюцца добрымі настаўнікамі і навуковымі работнікамі. Кожны студэнт павінен добра ведаць, што ен толькі тады будзе поўнацэнным будаўніком социялізма, калі ў дакладнасці аўладае навукай, а гэтага можна дабіцца толькі ўпартай працай, вучобай на «выдатна».

У нас ёсць студэнты — «выдатнікі», якія паказваюць прыклады вучобы. Але, на вялікі жаль, такіх студэнтаў дзесяткі. Лепшымі з іх з'яўляюцца Пятровіч — біяфак, Машкоўскі — фізмат, Камянецкі — геафак, Какашынскі — гістфак, Кукіна — хімфак і др.

Наш універсітэт рыхтуе высокакваліфікаваныя кадры для работы ў вышэйшых навучальных і навуковых установах, а таму разгортванню навукова - даследчай работы студэнты павінны ўдзяліць вялікую ўвагу.

Прайшоўшая канферэнцыя навукова-даследчых гурткоў зрабіла значны зрух у разгортванні гэтай работы, але яшчэ ёсць і такія факультэты, дзе канкрэтна амаль нічога не робяць (гістфак).

Шырока разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, разгортваючы рух выдатнікаў, знішчаючы недахопы, павышаючы якасць выкладання, — мы поўнасцю выканаем свае абавязкі, дадзім краіне социялізма добра падрыхтаваных высока-кваліфікаваных работнікаў, узброеных марксісцка-ленінскай тэорыяй, адданых партыі і совецкай уладзе, гатовых у любую мінуту выступіць на абарону нашай радзімы.

## Аб эксперыментальнай рабоце студэнтаў

Няма патрэбы многа гаварыць аб неабходнасці студэнту-батаніку умець праводзіць эксперыменты з раслінамі ў натуральнай абстаноўцы. Валоданне, напрыклад, вегетацыйным метадам аднолькава абавязкова як для будучага навуковага работніка, так і для выкладчыка біялогіі.

Ва ўмовах універсітэта мне прыходзілася часта назіраць як студэнт, бліскуча валодаючы літаратурным матэрыялам, зусім губляецца там, дзе сустракаецца з неабходнасцю мантыроўкі або выкарыстання апаратуры ці прылад, не гаворачы ўжо аб тым, што значная частка студэнтаў, будучых батанікаў, нават на старэйшых курсах зусім не знаёма з тэхнікай сістэматычнага назірання за развіццём раслін хоць-бы ва ўмовах вегетацыйнага доміка.

На веснавы перыяд гэтага года кафедра сумесна з навукова-даследчым гуртком студэнтаў намеціла прапрацаваць некалькі тэм эксперыментальнага характару. Гэта работа звязана з неабходнасцю пабудовы невялікага вегетацыйнага доміка і загатоўкі адпаведнага абсталявання.

Бясспрэчна, вясновыя эксперыменты з раслінамі — работа не толькі гуртковая. На маю думку, эксперыменты абавязковы для ўсяго студэнтцва біялагічнага аддзялення, і гэта неабходна ўлічыць у праграмах курса фізіялогіі, а іменна—перанесці частку гадзін практыкума на вясну і арганізаваць, такім чынам, спецыяльна веснавы, а быць можа, нават кароткатэрміновы летні практыкум па фізіялогіі раслін.

Нарэшце, неабходна сказаць аб студэнцкіх навукова-даследчых гуртках пры кафедры анатоміі і фізіялогіі раслін, работа якіх носіць кампанейскі характар, часова ажыўляючыся і заміраючы.

**Асістэнт КАЛІШЗВІЧ.**

## Водгукі студэнтаў аб фільме „Партыйны білет“

**Фільм «Партыйны білет» — адна з лепшых кінокарцін совецкай кінематаграфіі.**

**Асноўная тэма карціны — большэвіцкая пільнасць да нпасавага ворага, які ў новых умовах набыў тонкую, складаную форму класавай барацьбы.**

**Гэта карціна каштоўна тым, што яна дэманструецца ў час, калі наша партыя праводзіць абмен партыйных дакументаў.**

**Гэты выдатны фільм павінны праглядзець і сур'ёзна прадумаць усе нашы студэнты.**

## Калектыўна праглядзелі і абмеркавалі фільм „Партыйны білет“

Кінокарціна «Партыйны білет» з'явілася на экране надзвычай своечасова. Яна заклікае нас да большэвіцкай пільнасці. Яна вучыць нас хаваць, як зяніцу вока, партыйны білет. Яна—яркі паказ таго, як класавы вораг сваю падрыўную работу праводзіць «ціхай санай».

Праверка партдакументаў дапаматла нам выявіць і выгнаць з партыі чужакоў. Але гэта ні ў якім разе не гаворыць, што мы павіны супакоіцца. Партгрупа рабфака пасля праверкі партдакументаў выявіла, што кандыдат партыі Міхеда В. у часе ўступлення ў партыю і праверді партдакументаў скрыў сваю судзімасць за кантрабанду, сваю сувязь з кулакамі. У пытанні павышэння большэвіцкай пільнасці фільм «Партыйны білет» многаму і многаму вучыць.

Партгрупа рабфака арганізавала калектыўны паход і абмеркаванне карціны «Партыйны білет».

**Парторг рабфака НАПАДОЎСКІ.**

## *ХВАЛЮЮЧЫ ФІЛЬМ*

Кінокарціна «Партыйны білет» — хвалюючая карціна. Надзвычай ярка і ўдала адлюстроўвае яна партыйнае жыццё. Лішні раз напамінае аб уважлівым захаванні партыйнага білета і аб тым, каму ён павінен належаць.

Фільм вучыць, як распазнаваць класавага ворага, вучыць большэвіцкай пільнасці. Яшчэ і яшчэ раз напамінае словы таварыша Сталіна, што «рэволюцыйная пільнасць з'яўляецца той самай якасцю, якая асабліва неабходна зараз большэвікам».

Карціна надзвычай цікавая і каштоўная; яна адлюстроўвае буйныя дасягненні совецкай кіноматаграфіі.

**ЦІШЧАНКА (хімфак)**

## ПРАЎДЗІВАЯ КАРЦІНА

Я з захапленнем глядзеў гэту карціну. Яна на мяне зрабіла велізарнейшае ўражанне. У гэтай карціне праўдзіва паказаны нашы заклятыя ворагі. Выключна мастацкае выкананне звязана з высокім палітычным зместам. Тут паказваецца, як рэшткі разбітых класаў маскіруюцца і выкарыстоўваюць прытупленне класавай пільнасці асобных комуністаў. Карціна дапамагае нам разбірацца ў людзях, дапамагае ўзняць большвіцкую пільнасць і глыбока вывучаць кожнага чалавека. Яна будзіць класавую непрымірымасць да ворагаў. Фільм вельмі просты, зразумелы і праўдзівы.

**Е. А. МАРМАЛЕЎСКІ.**
**(II курс геафака)**

Прыжок з вышкі

**ФІЗКУЛЬТУРА**

## Рыхтавацца да веснавога кроса імя тав. Шверніка

Падрыхтоўка да веснавога кроса імя тав. Шверніка павінна адыграць вялікую ролю ў справе разгортвання фізкультурнай работы.

Падрыхтоўка да кроса пачалася. Але далека не ўсе фізоргі ўзяліся за работу. Фізорг геафака тав. Шырэй бяздейнічае. Ён рашыў зусім не вылучаць удзельнікаў кроса. Не лепш абстаіць справа і на фізмаце (фізорг тав. Остроўскі).

Мы можам і павінны арганізаваць для ўдзелу у кросе каманду не менш як у 150 чалавек. Трэба толькі ўсёй грамадскасці універсітэта дапамагчы фізкультурнікам ў гэтай справе. Галоўную ініцыятыву ў падрыхтоўцы да кроса павінна праявіць наша комсамольская арганізацыя.

Валейбольная каманда (Вараб'ёў, Маніс і інш) у першых таварыскіх веснавых сусрэчах з камандамі медыцынскага, палітэхнічнага інстытутаў і АБВШ па валейболу атрымала перамогу.

Добра працуе секцыя бокса, якая ў гарадскіх спаборніцтвах дабілася значных поспехаў. З астатнімі відамі спорту справа абстаіць дрэнна. Вельмі мала студэнтаў наведваюць гімнастычную секцыю.

Фізкультурнікі ўнівірсітэта ў веснавым кросе імя тав. Шверніка павінны заняць першае месца. На гэта ў нас ёсць усе магчымасці.

**КОСАР.**

## Умацоўваем абарону нашая оадзімы

Асоавіяхімаўская арганізацыя і ваенная кафедра ўніверсітэта ў часе падрыхтоўкі да Першага мая значна ўмацавалі абронную работу. За гэты перыяд падрыхтавана 100 новых варашылаўскіх стралкоў, 40 значкістаў «ГСО» першай ступені і больш 200 значкістаў «ПВХО».

Узмоцнена праходзіць падрыхтоўка 17 планерыстаў першай ступені і двух планерыстаў другой ступені.

Наша каманда (12 чалавек) у гарадскіх спаборніцтвах ПВХО заняла другое месца, а студэнткі **Гроскрейц, Кавецкая, Барысевіч, Квеська, Кубіцная** на стральбе ў процігазах занялі першае месца.

Каманда ў 15 чалавек, якая прымала ўдзел ва ўсесаюзных стралковых спаборніцтвах вышэйшых навучальных устаноў заняла чацвертае месца.

Пераможцы гарадскога спаборніцтва па стральбе ў процігазах.

## *Эпізоды з жыцця студэнцтва і моладзі за граніцай*

**(Па матэрыялах журнала «За рубежом і «Комсомольской правды»)**

Аб выключна жудасным становішчы студэнтцва і моладзі ў краінах капітала вымушан пісаць нават буржуазны друк. Адзін польскі журналіст, апісваючы становішча студэнтаў варшаўскага ўніверсітэта, піша так:

«Студэнт 2 курса юрыдычнага факультэта Владзіслаў Н. сказаў мне:

— Мае бацькі жывуць пад Ломжай. Закончыўшы гімназію, я прыехаў у Варшаву, каб паступіць ва ўніверсітэт. Там я даведаўся, што пры паступленні трэба ўнесці 30 злотых. На гэта пайшлі ўсе мае грошы. У мяне нічога не засталося на начлег, я спаў на вакзале, а днём хадзіў з дома ў дом у пошуках работы, аднак нідзе работы не знаходзіў.

Нарэшце, я страціў надзею штонебудзь зарабіць. Хацелася толькі знайсці прытулак, дзе можна было-б хоць выспацца. Так прайшло 36 дзён. 36 дзён я хадзіў па гораду, 36 начэй правёў на вакзале, на лаўках алей і ў кустах Саксонскага саду. Нарэшце, калі сілы зусім мяне пакінулі, я сустрэў добрую дворнічыху, якая дазволіла мне жыць у чулане, за гэта я дапамагаў ёй убіраць дом і тратуары.

Зараз я прадаю газеты «Вечур варшаўскі» і інш.—штодзенна каля 20 нумароў. Гэтым і жыву. У мяне яшчэ няма навыку, таварышы ўмудраюцца прадаць да 50 экземпляраў у дзень.

Спадзяюся, і я дасягну гэтага».

Вось аб чым марыць студэнт юрыдычнага факультэта.

Я не стаў пытацца ў Владзіслава Н. аб яго здароўі, бо страшная худоба, кірпічны румянец і сухі кашаль гаварылі аб гэтым даволі выразна.

Другі студэнт—А. С. знаходзіцца ў значна лепшым становішчы: ён атрымаў пасаду кур'ера ў міністэрстве фінансаў.

— Я разношу агладныя лісты платнікам падатку. За кожны ліст атрымоўваю сем грошай. Пасля дзённай бегатні ногі гараць, як у агні.

— Чым вы жывеце?—запытваю студэнта Р. С. з Кельцаў.

— Надзеяй, што калі-небудзь стане лягчэй».

Рэволюцыйны журнал «АШ», які выходзіць у Празе, разаслаў у цэлы рад краін пісьмы—звароты да моладзі з пытаннем: «Як ты ўяўляеш сабе сваё будучае?» У адказ прышло 117 пісем з розных краін свету.

22-гадовы эльзасец Анты К. піша:

«Я працаваў на шкляным заводзе, дзе нажыў туберкулёз. Мяне чакае сумная будучыня. Цяжка працаваць я больш не магу. Каб я жыў у соцыялістычным грамадстве, усё было-б па-іншаму: я могбы ажыццявіць маю адзіную мару—стаць скрыпачом. У мяне вялікія здольнасці да музыкі, у мяне ёсць скрыпка, але нашто мне яна? Я ўсяго толькі бедны шклодуў, хворы туберкулёзам. Школа для мяне недаступна, і я рад, калі ў мяне ёсць кусок хлеба. Але я ведаю, што ўсё пераменіцца, народны фронт дасягне сваёй мэты. Дарагая рэволюцыйная моладзь свету! Шлях, па якому мы ідзем, повен туману і небяспекі! Нас хочуць уцягнуць у вайну. Але мы не для таго радзіліся каб паміраць,- мы хочам жыць!».

Малады швейцарац піша:

«Я хацеў стаць тэхнікам-будаўніком, нават архітэктарам. Бацька зрабіў усё, каб даць мне магчымасць вучыцца. Год я правучыўся ў будаўнічым тэхнікуме. Але, што мяне чакае?

Нават старыя, вопытныя архітэктары ходзяць без работы... А што чакае нас, маладых? Што дае нам наша спецыяльнасць? Каму патрэбны нашы здольнасці, наша даравітасць, нашы жаданні?».

Варшаўскі «Роботнік» піша:

«Капіталістычны лад губіць здароўе моладзі.

Паводле даных за 1931 год, у 28,7 проц. абследаваных маладых рабочых была павышаная тэмпература... Трэба адзначыць, што гэта лічба толькі часткова паказвае сапраўднае становішча. Рэчаіснасць ва многа раз горшая.

Праведзеная сярод маладых рабочых анкета паказала, што 60 проц. апытаных не мелі ўласнай кватэры.

Заработак маладога сельскагаспадарчага рабочага складае 35-37 грошай у дзень. Не цяжка ўявіць сабе, як дрэнна ён харчуецца, хоць займаецца цяжкай фізічнай працай.

Сялянскай і рабочай моладзі недаступна сярэдняя школа. Колькасць вучняў у сярэдняй школе падае: у 1928-29 г. было 203 тыс., а ў 1934г. толькі 159 тыс...»

Адна французская газета піша аб становішчы ў капіталістычных краінах: «Прайшла вайна, затым рэволюцыя, інфляцыя і крызіс. Моладзь у Германіі больш, чым у іншых краінах, у роспачы перад панаваўшым хаосам. Яна слухала расказы аб шчаслівых даваенных часах і...галадала. Ей імкнуліся ўнушыць надзеі на будучае, а між тым у яе на глазах разбураліся асновы ранейшага нацыянальнага жыцця...

Сярод 5 млн. беспрацоўных 1.750 тыс. складае моладзь да 25 год... Гітлер на апошнім нюрэнбергскім з'ездзе нацыянал-соцыялісцкай партыі хваліўся, што ён вярнуў на вытворчасць 5 млн. беспрацоўных.

На вялікі жаль, статыстыка не падтрымлівае яго аптымізму. Толькі 3 млн. атрымалі работу. Што-ж з апошнімі? На гэта цяжка адказаць. Большасць харчуецца селядцамі і маргарынам у працоўных лагерах і казармах.

... Французская моладзь перажывае падобны-ж крызіс... Асабліва пацярпела ад беспрацоўя інтэлігенцыя. Гэта залежыць не толькі ад эканамічнай дэпрэсіі, але і ад універсітэцкай «перавытворчасці».

Усё расце колькасць людзей з дыпломамі. А між тым грамадства ўжо насычана інтэлігентамі. Лёгка сабе ўявіць настрой гэтых беспрацоўных: прымус да бяздзейнага жыцця або да заняткаў некваліфікаванай працай гасяць веру у сябе і энтузіязм, уласцівы іх узросту, і пагружаюць у безнадзейны песімізм».

Менск, друкарня «Звязды» Горліт № 867 Тыраж 1000. Адказны рэдактар АЛАЙ.